**Тэма**: Дзеепрыметнікі залежнага стану прошлага часу. Правапіс суфіксаў -н-, -ан, -ен-, -т- у дзеепрыметніках.

**Мэта**: садзейнічаць фарміраванню ўмення тлумачыць утварэнне дзеепрыметнікаў прошлага часу, правільна утвараць і ўжываць іх у сваім маўленні, выпрацоўваць навык правільнага напісання суфіксаў –н-, -ен-, -ан,-т-.

**Задачы:**
- выпрацоўваць уменне вызначаць утваральную аснову і ўтваральныя сродкі дзеепрыметнікаў залежнага стану прошлага часу;
- фарміраваць навыкі беспамылковага ўтварэння і напісання дзеепрыметнікаў;
- дарэчна ўжываць дзеепрыметнікі ва ўласным маўленні пры стварэнні вусных і пісьмовых тэкстаў;
- выхоўваць любоў і павагу да роднага слова.

**Ход урока**

**I**. **Арганізацыйны момант** (гучыць песня "Сёння ў нашай хаце свята")

***Настаўнік:***
- Добры дзень, дзеці! Добры дзень, паважаныя госці!Дзеці, а якія ветлівыя словы-прывітанні вы ведаеце?

***Дзеці :***
Добры дзень добрым людзям!
Божае Вам блаславенне!
Добрага Вам здароўя!
З мірам прымаем, дабра жадаем!

***Настаўнік:***
- Дарагія дзеткі, я жадаю вам дабра, поспехаў і плённай працы!
*(Запіс даты і тэмы ў сшытку)*

Ў добры час, на ўлонні вясковым,
дзе вадзіца крынічная б'е,
навучыўся я матчынай мове
І **задуманых** песняў яе.
Многа ёсць **недасягнутых** скарбаў,
яшчэ болей прываблівых мар.
Я яе ні за што не аддаў бы,
бо яна найвялікшы мой скарб!
*Ларыса Геніюш*
*Мая мова.*

**II. Матывацыйны момант.**
**1. Работа з эпіграфам** (*настаўнік чытае радкі з верша Л.Геніюш "Мая мова"*)
- Якім настроем прасякнуты радкі з верша *Л.Геніюш*? (*любоўю да роднай мовы*).

**III. Праверка дамашняга задання**
***1.1*** Практ.72.
***1.2*** Тры вучні працуюць з карткамі

**IV. Работа па тэме ўрока**

**Актуалізацыя раней вывучанага**

*а) Гутарка ў межах наступных пытанняў:*

1. Што такое дзеепрыметнік? (*Нязменная форма дзеяслова*).
2. Прыметы якіх часцін мовы ён мае? (*Прыметніка, дзеяслова*).
3. Як прыметнік, па чым змяняецца? (*Род, лік, склон*).
4. Як дзеяслоў, дзеепрыметнік мае…(*Час, трыванне*).
5. Які час, трыванне? (*Цяперашні і прошлы час, закончанае і незакончанае трыванне*).
6. А што яшчэ мае дзеепрыметнік? (*Стан*).
7. Які? (*Залежны і незалежны*).
8. Што абазначае залежны і незалежны стан? (*Прымету, якую ўтварыў сам прадмет, асоба; прымету, якую ўтварыў іншы прадмет або асоба*).

*б) Ад дзеясловаў утварыце формы дзеепрыметнікаў. Запішыце словазлучэнні.*

Злавіць рыбу, напісаць пісьмо, знайсці грыб, зламаць галінку, пачуць навіну, пашыць кажух.

*в) Растаўце прапушчаныя знакі прыпынку. Падкрэсліце дзеепрыметнікавыя звароты.*

1.Непадалёк задымілася апаленая маланкай сасна.

2.У расколіне, парослай зялёным мохам, учапілася карэньчыкамі за зямлю тоненькая бярозка.

3.Уражаныя словамі дырэктара, яны стаялі моўчкі.

**V. Тлумачэнне новага матэрыялу**

**Арганізацыя пазнавальнай дзейнасці вучняў**

**1.***Франтальнае апытванне*

- Давайце ўспомнім, што не ўваходзіць у аснову інфінітыва? *(-ць,- ці,- чы*).
- Запішыце і вусна прааналізуйце прапанаваныя прыклады ўтварэння дзеепрыметнікаў, зрабіце вывад: ад якіх асноў утварыліся дзеепрыметнікі і якія яны маюць суфіксы?

*засеяць – засеяны;*

*сарваць – сарваны;*

*прывезці – прывезены;*

*асвятліць – асветлены.*

- Пасля якіх літар пішацца ў дзеепрыметніках суфікс –н-? (*а, я*).
- А суфіксы -ен-, -ан-? (*Пасля зычных*).
- А што адбываецца з галоснымі літарамі *е,і,ы*, якія былі ў аснове дзеяслова? (*Яны выпадаюць*).
- Ці бывае -нн- у суфіксах дзеепрыметнікаў? (*Не*).

**2.** *Работа са схемай-памяткай*

| | |
|---|---|
| **-а, -я ЦЬ** | **- Н** (паказаць, пасеяць) |
| **-е, -і, -ы ЦЬ** | **- ЕН, - АН** (купіць, упрыгожыць, разгледзець) |
| **зычны ЦІ** | **- ЕН, - АН** (завезці) |
| **аднаскладовы корань** | **- Т** (паліць, зжаць) |
| **-о, -у,-ну ЦЬ** | **- Т** (раскалоць, апрануць, раздзьмуць) |

**2.** *Самастойнае знаёмства з тэарэтычным матэрыялам на с. 42-44*

**3.** ***Работа з эпіграфам урока***
- А зараз давайце зноў звернемся да эпіграфа ўрока. Знайдзіце ў ім дзеепрыметнікі, вызначце, ад якой асновы дзеяслова яны ўтварыліся і пры дапамозе якіх суфіксаў.

Задуманых – задумаць (-н)
недасягнутых – не дасягнуць (-т)

***Фізкультхвілінка***

**VI. Замацаванне ведаў вучняў**
*1. Работа ля дошкі*
Пр. 72 (вучні па ланцужку выходзяць да дошкі).

*2. Работа па картках*
*1.Замяніце дзеясловы дзеепрыметнікамі залежнага стану і ўтварыце словазлучэнні*
Прынесці (вада), сабраць (ураджай), расказаць (верш), пабудаваць (хата), пражыць (год), зламаць (галінку), асушыць (балота), паліць (кветкі).

*3.Знайдзіце няправільна ўтвораныя і запісаныя дзеепрыметнікі. Выпраўце памылкі, запішыце правільны варыянт.*
Адпушчаныя сродкі, **прыклееяная афіша**, пражыты век, **паселіныя ў новыя дамы**, **апісаннае падарожжа**, занесеныя ветрам, паднятая крышка, **накормляныя дзеці**, пастаўленыя ў рад, **пералічэнныя асаблівасці**, акуратна прычасаны, **знясіліныя ў барацьбе**.

*4. Заданне "Знайдзі лішняе".*
1. Пажаўцелая, зарослыя, **прыбраны**, збялелы.
2. Ацалелы, **шэпчацца**, куплены, пасеяны.
3. **Размясціў**, адкрытых, заснаваных, вывучаных.
4.З'едзены, упрыгожаны, прынесены, **пачырванелая**.

*5. Заданне. Замяніце другую частку сказа дзеепрыметнікамі.*
1. Не купіш таго дня, які страціў.
2. Перацягне лёгкі рубель тая капейка, якую набылі мазалём.

*6. На дошцы запісаны прыказкі. Вучні зачытваюць і тлумачаць іх сэнс. Знаходзяць дзеепрыметнікі, вызначаюць, ад якой асновы дзеяслова яны ўтвораны і пры дапамозе якіх суфіксаў.*
1 Лепш напрацаванае, чым пазычанае.
2. На Івана ноч адарвана.
3. Не кручаны – не рэмень, не вучаны – не чалавек.

*7. Прачытайце тэкст. Вызначце стыль і тып маўлення. Знайдзіце і вызначце дзеепрыметнікі, вызначце суфіксы.*

**Крыж Ефрасінні Полацкай**

У 1162 годзе полацкі ювелір Лазар Богша стварыў па заказе Ефрасінні Полацкай крыж. Крыж шасціканцовы, даўжынёй 51 сантыметр, аснова драўляная. На

пярэдняй і адваротнай плоскасцях **прымацаваны** 11 залатых пласцін, **аздобленых** перагародчатымі каляровымі эмалямі з выявамі святых, арнаментальнымі кампазіцыямі, каштоўнымі камянямі. Бакі крыжа **абкладзены** сярэбранымі пазалочанымі пласцінамі. На іх **прасечаны** надпіс, у якім паведамляецца гісторыя стварэння рэліквіі, дата, імя майстра. Да 1941 года крыж захоўваўся ў Магілёўскім краязнаўчым музеі. У час вайны крыж быў **вывезены** акупантамі, месца яго знаходжання сёння невядома.

**VI. Падвядзенне вынікаў урока**

*Падымаем левую руку, калі дзеепрыметнікі ўтвораны пры дапамозе суфікса – н:*

раскладзеныя, **дараванае**, напоенае, **засланы**, скошаная, **намаляваны**, **падрыхтаваны**, заплецены, вывучаны, **пафарбаваны**.

**Рэфлексія**

1. Якое заданне для вас на ўроку было самым складаным?
2. Якое заданне было найбольш лёгкім?
3. Ці спадабаўся вам урок?

**VII. Дамашняе заданне:** скласці заданне “Знайдзі лішняе” па тэме ўрока.